ПАПА ЛЕЎ XIV

АПОСТАЛЬСКІ ЛІСТ

IN UNITATE FIDEI

З НАГОДЫ 1700-Й ГАДАВІНЫ НІКЕЙСКАГА САБОРУ

1. У адзінстве веры, якая абвяшчаецца ад пачатку Касцёла, хрысціяне пакліканы да згоднага пілігрымавання, захоўваючы і перадаючы з любоўю і радасцю атрыманы дар. Гэта выяўляецца ў словах *Credo*: «Верым у Езуса Хрыста, Сына Божага Адзінароднага, які дзеля нашага збаўлення зышоў з неба», сфармуліраваных 1700 гадоў назад Нікейскім Саборам, першым сусветным у гісторыі хрысціянства.

Падчас падрыхтоўкі да апостальскага падарожжа ў Турцыю, гэтым лістом хачу заахвоціць увесь Касцёл аднавіць энтузіязм вызнання веры, праўда якой цягам стагоддзяў была супольнай спадчынай хрысціянаў і заслугоўвае таго, каб яе вызнавалі і паглыблялі ўсё новымі і актуальнымі спосабамі. У сувязі з гэтым быў зацверджаны важны дакумент Міжнароднай Тэалагічнай Камісіі – «*Езус Хрыстус, Сын Божы, Збаўца. 1700-я гадавіна Сусветнага Нікейскага Сабору*». Я спасылаюся на яго, бо ён прапануе карысныя перспектывы для разумення важнасці і актуальнасці Нікейскага Сабору не толькі ў аспекце тэалагічным і касцёльным, але культурным і сацыяльным.

2. «Пачатак Евангелля Езуса Хрыста, Сына Божага», – так распачынае сваё Евангелле св. Марк, падсумоўваючы ўсё яго пасланне менавіта ў знаку Божага сыноўства Езуса Хрыста. Таксама апостал Павел ведае, што ён пакліканы абвяшчаць Евангелле Бога пра Яго Сына, які памёр і ўваскрос дзеля нас (пар. *Рым* 1, 9), які з'яўляецца апошнім «так» Бога для абяцанняў прарокаў (пар. *2 Кар* 1, 19-20). У Езусе Хрысце Слова, якое было Богам ад пачатку часоў і праз якое было створана ўсё, – як кажа пралог Евангелля паводле св. Яна, – «сталася целам і пасялілася між намі» (*Ян* 1, 14). У Ім Бог стаў нашым бліжнім, таму ўсё, што мы робім кожнаму з нашых бароў, мы робім таксама Яму (пар. *Мц* 25, 40).

Таму гэта невыпадковы збег абставінаў, што ў гэты Святы Год, прысвечаны нашай надзеі, якой з'яўляецца Езус Хрыстус, мы адзначаем таксама 1700-ю гадавіну Першага Сусветнага Сабору ў Нікеі, які ў 325 г. абвясціў вызнанне веры ў Езуса Хрыста, Сына Божага. Гэта сэрца хрысціянскай веры. Нават сёння, падчас нядзельнай Эўхарыстыі, мы чытаем Нікейска-Канстанцінопальскі сімвал, вызнанне веры, якое аб'ядноўвае ўсіх хрысціянаў. У цяжкія часы, у якія мы жывём, сярод столькіх трывог і страхаў, пагроз вайны і гвалту, стыхійных бедстваў, сур'ёзнай несправядлівасці і няроўнасці, голаду і галечы, якія церпяць мільёны нашых братоў і сясцёр, яно дае нам надзею

3. Часы Нікейскага Сабору былі не менш бурлівыя. Калі ён распачынаўся ў 325 г., яшчэ былі свежымі раны ад пераследу хрысціянаў. Міланскі эдыкт аб

талерантнасці (313 г.), выдадзены двума імператарамі, Канстанцінам і Ліцыніем, здавалася, абвяшчаў пачатак новай эпохі міру. Аднак знешнія пагрозы хутка прывялі да спрэчак і канфліктаў унутры Касцёла.

Арый, прэзбітэр з Александрыі ў Егіпце, вучыў, што Езус не быў сапраўдным Сынам Божым; нават, калі б Ён быў не проста стварэннем, Ён быў бы пасрэднікам паміж недасягальна далёкім Богам і намі. Таму, павінен быць час, калі Сын «не існаваў». Гэты погляд адпавядаў распаўсюджанаму меркаванню таго часу і таму здаваўся прымальным.

Аднак Бог не пакідае свой Касцёл, заўсёды кліча адважных мужчын і жанчын, сведкаў веры і пастыраў, якія вядуць Яго народ і паказваюць яму шляхі Евангелля. Біскуп Аляксандр з Александрыі разумеў, што вучэнне Арыя цалкам супярэчыць Святому Пісанню. Паколькі Арый не жадаў прымірэння, Аляксандр склікаў біскупаў Егіпта і Лібіі на Сінод, які асудзіў вучэнне Арыя; затым ён разаслаў ліст іншым біскупам Усходу, падрабязна інфармуючы іх пра гэта. На Захадзе пачаў дзейнічаць біскуп Осій з Кордабы ў Іспаніі, які ўжо раней паказаў сваю руплівасць у вызнанні веры падчас ганенняў пры імператары Максіміяне і карыстаўся даверам Біскупа Рыма, папы Сільвестра.

Аднак прыхільнікі Арыя таксама аб’ядналіся. Гэта прывяло да аднаго з найвялікшых крызісаў у гісторыі Касцёла першага тысячагоддзя. Прычынай спрэчкі было не другараднае пытанне. Гэта была аснова хрысціянскай веры, а менавіта адказ на вырашальнае пытанне, якое Езус задаў сваім вучням у Цэзарэі Філіпавай: «А вы кім лічыце Мяне?» (*Мц* 16,15).

4. Па меры ўзмацнення спрэчак імператар Канстанцін зразумеў, што разам з адзінствам Касцёла пад пагрозай апынулася і адзінства Імперыі. Ён склікаў усіх біскупаў на Сусветны, або агульны, Сабор у Нікею, каб аднавіць адзінства. Сінод, вядомы як сход «318 Айцоў», узначальваў імператар; колькасць сабраных біскупаў была беспрэцэдэнтнай. Некаторыя ўсё яшчэ насілі сляды катаванняў, перанесеных падчас ганенняў. Пераважная большасць з іх была з Усходу, і, здаецца, толькі пяць былі з Захаду. Папа Сільвестр даручыў гэтую справу аўтарытэтнай у тэалагічным плане асобе – біскупу Осію з Кордабы і паслаў двух рымскіх прэзбітэраў.

5. Айцы Сабору засведчылі сваю вернасць Святому Пісанню, Апостальскай Традыцыі і таму, што вызналі падчас хросту, згодна з наказам Езуса: «Дык ідзіце і навучайце ўсе народы, і хрысціце іх у імя Айца і Сына, і Духа Святога» (*Мц* 28, 19). На Захадзе існавалі розныя формулы, у тым ліку, г.зв., Апостальскае *Credo*.[1] На Усходзе таксама існавала шмат падобных па структуры хросных вызнанняў веры. Іх мова не была вучоная або складаная, а хутчэй – як пазней высветлілася – простая і зразумелая для рыбакоў з-над Галілейскага мора.

Зыходзячы з гэтага, Нікейскае *Credo* пачынаецца з вызнання: «Верым у *адзінага* Бога, Айца ўсемагутнага, Стварыцеля ўсяго бачнага і нябачнага».[2] Такім чынам Айцы Сабору выказалі сваю веру ў аднаго і адзінага Бога. Падчас Сабору спрэчак па гэтым пытанні не было. Але абмяркоўваўся другі артыкул, які таксама выкарыстоўвае біблійную мову для вызнання веры ў «*адзінага* Пана, Езуса Хрыста, Сына Божага». Прычынай дыскусіі стала неабходнасць адказаць на пытанне, узнятае Арыем: як трэба разумець фразу «Сын Божы» і як яе можна суаднесці з біблійным монатэізмам. Таму Сабор быў закліканы вызначыць правільнае значэнне веры ў Езуса як «Сына Божага».

Айцы Сабору вызналі, што Езус – гэта Сын Божы, таму што Ён «*з сутнасці* (*ousia*) *Айца* [...] народжаны, а не створаны, той жа сутнасці (*homooúsios*) як Айцец». Гэтым азначэннем тэзіс Арыя быў радыкальна адхілены.[3] Каб выказаць праўду веры, Сабор выкарыстаў два словы: «сутнасць» (*ousia*) і «адзінасутны» (*homooúsios*), якіх няма ў Святым Пісанні. Пры гэтым ён не меў намеру замяніць біблійныя сцвярджэнні грэцкай філасофіяй. Наадварот, Сабор выкарыстаў гэтыя тэрміны, каб выразна пацвердзіць біблійную веру і адрозніць яе ад эліністычнай памылкі Арыя. Такім чынам, абвінавачванне ў элінізацыі адносіцца не да нікейскіх Айцоў, а да ілжывага вучэння Арыя і яго паслядоўнікаў.

З пазітыўнага пункту гледжання, нікейскія Айцы хацелі застацца вернымі біблійнаму монатэізму і рэалізму ўцелаўлення. Яны хацелі падкрэсліць, што адзіны, сапраўдны Бог не з'яўляецца недасягальна далёкім для нас, а, наадварот, наблізіўся да нас і выйшаў нам насустрач у Езусе Хрысце.

6. Каб выказаць сваё пасланне простай мовай Бібліі і літургіі, знаёмай усяму Божаму народу, Сабор выкарыстоўвае некаторыя фармуліроўкі з хроснага вызнання веры: «Бог ад Бога, Святло ад Святла, Бог сапраўдны ад Бога сапраўднага». Затым Сабор звяртаецца да біблійнай метафары святла: «Бог ёсць Святло» (*1 Ян* 1, 5; пар. *Ян* 1, 4-5). Як святло бясконца выпраменьвае і перадае сябе, так і Сын ёсць адлюстраваннем (*apaugasma*) славы Бога і вобразам (*character*) Яго быцця (*hipostaza*) (пар. *Гбр* 1, 3; *2 Кар* 4, 4). Таму Уцелаўлёны Сын, Езус, – святло свету і жыцця (пар. *Ян* 8, 12). Праз хрост асвятляюцца вочы нашага сэрца (пар. *Эф* 1, 18), каб і мы маглі быць святлом свету (пар. *Мц* 5, 14).

Урэшце, *Credo* сцвярджае, што Сын – гэта «Бог сапраўдны ад Бога сапраўднага». У многіх месцах Біблія адрознівае мёртвых ідалаў ад сапраўднага і Жывога Бога. Сапраўдны Бог – гэта той, хто прамаўляе і дзейнічае ў гісторыі збаўлення: Бог Абрагама, Ісаака і Якуба, які аб'явіўся Майсею ў палаючым кусце (пар. *Зых* 3, 14); Бог, які бачыць пакуты народу, чуе іх крык, вядзе іх праз пустыню і сапутнічае ім у вогненным слупе (пар. *Зых* 13, 21); прамаўляе да яго голасам грому (пар. *Дрг* 5, 26) і спачувае яму (пар. *Ос* 11, 8-9). Таму хрысціянін пакліканы да вяртання ад мёртвых ідалаў да Жывога і сапраўднага Бога (пар. *Дз*

12, 25; *1 Тэс* 1, 9). У гэтым сэнсе Сымон Пётр вызнае ў Цэзарэі Філіпавай: «Ты – Хрыстус, Сын Бога Жывога» (*Мц* 16, 16).

7. Нікейскае *Credo* не фармулюе філасофскай тэорыі. Яно вызнае веру ў Бога, які збавіў нас праз Езуса Хрыста. Ён – Жывы Бог: Ён хоча, каб мы мелі жыццё і мелі яго ў дастатку (пар. *Ян* 10, 10). Таму *Credo* працягваецца словамі хроснага вызнання веры: Сын Божы, які «дзеля нас, людзей, і дзеля нашага збаўлення зышоў з неба, уцелавіўся і стаўся чалавекам, быў замучаны, на трэці дзень уваскрос, узышоў на неба і прыйдзе судзіць жывых і памерлых». Гэта выразна паказвае, што хрысталагічныя пастулаты веры Сабору ўплецены ў гісторыю збаўлення паміж Богам і Яго стварэннямі.

Святы Атаназій, які ўдзельнічаў у Саборы як дыякан біскупа Аляксандра і змяніў яго на пасадзе біскупа ў Александрыі ў Егіпце, неаднаразова і вынікова падкрэсліваў сатэрыялагічны аспект Нікейскага *Credo*. Ён пісаў, што Сын, зышоўшы з неба, «сам зрабіў нас сынамі для Айца і абагавіў людзей, стаўшы чалавекам. Ён не быў спачатку чалавекам, а потым стаў Богам, але, будучы Богам, потым стаўся чалавекам, каб менавіта нас зрабіць багамі».[4] Гэта магчыма толькі тады, калі Сын сапраўды ёсць Богам: бо ніякая смяротная істота не можа перамагчы смерць і збавіць нас; толькі Бог можа зрабіць гэта. Гэта Ён вызваліў нас у сваім Сыне, які стаўся чалавекам, каб мы маглі быць свабоднымі (пар. *Гал* 5, 1).

У Нікейскім *Credo* варта звярнуць увагу на дзеяслоў *descendit* – «зышоў». Святы Павел апісвае гэты рух моцнымі словамі: «[Хрыстус] выракся самога сябе, прыняўшы постаць слугі, прыпадобніўшыся да людзей» (*Флп* 2, 7). Як гаворыцца ў пралогу Евангелля паводле св. Яна: «Слова сталася целам і пасялілася між намі» (*Ян* 1, 14). Таму Пасланне да Габрэяў вучыць: «Бо мы маем не такога Першасвятара, які не мог бы спачуваць нашым слабасцям, але такога, які, паводле падабенства [да нас], зведаў усе выпрабаванні, акрамя граху» (*Гбр* 4, 15). Увечары перад смерцю Ён прынізіў сябе, як слуга, каб абмыць ногі вучням (пар. *Ян* 13, 1-17). А апостал Тамаш, толькі тады, калі змог дакрануцца пальцамі да раны ў баку ўваскрослага Пана, вызнаў: «Пан мой і Бог мой!» (*Ян* 20, 28).

Менавіта дзякуючы ўцелаўленню мы сустракаем Пана ў нашых патрабуючых братах і сёстрах: «Усё, што вы зрабілі ім, вы Мне зрабілі» (пар. *Мц* 25, 40). Нікейскае *Credo*, такім чынам, не кажа нам пра далёкага, недасяжнага, нерухомага Бога, які спачывае ў сабе, але пра Бога, які блізкі да нас, які суправаджае нас у нашым вандраванні па сцежках свету і ў самых цёмных кутках зямлі. Яго невымернасць выяўляецца ў тым, што Ён прымяншае сябе, пазбаўляе сябе сваёй бясконцай велічы, становячыся нашым бліжнім у пакорлівых і бедных. Гэты факт робіць пераварот у язычніцкіх і філасофскіх канцэпцыях Бога.

Яшчэ адно слова з Нікейскага *Credo* мае асаблівае значэнне для нас сёння. Біблійнае сцвярджэнне «ўцелавіўся» ўдакладняецца словам «чалавек» пасля слова «ўцелавіўся». Гэтым Нікея дыстансуецца ад ілжывай дактрыны, паводле якой *Logos* прыняў толькі цела як знешнюю абалонку, а не чалавечую душу, надзеленую розумам і вольнай воляй. Наадварот, імкнецца пацвердзіць тое, што выразна абвясціў Халкідонскі Сабор у 451 годзе: у Хрысце Бог прыняў і адкупіў усю чалавечую істоту, з целам і душою. Сын Божы стаўся чалавекам, – тлумачыць св. Атаназій, – каб мы, людзі, маглі стаць боскімі.[5] Гэтае канкрэтнае разуменне Божага Аб'яўленя было падрыхтавана св. Ірынэем Ліёнскім і Арыгенам, а затым развіта ў багатай усходняй духоўнасці.

Абагаўленне не мае нічога агульнага з самаабагаўленнем чалавека. Наадварот, абагаўленне абараняе нас ад першай спакусы стаць як Бог (пар. *Быц* 3, 5). Чым Хрыстус з'яўляецца паводле натуры, тым мы становімся дзякуючы ласцы. Праз справу адкуплення Бог не толькі аднавіў нашу чалавечую годнасць як Божага вобраза, але цудоўным чынам той, хто стварыў нас, зрабіў нас яшчэ больш цудоўным чынам удзельнікамі сваёй боскай натуры (пар. *2 П* 1, 4).

Такім чынам, абагаўленне – гэта сапраўдная гуманізацыя. Вось чаму існаванне чалавека пераўзыходзіць яго самога, шукае па-за ім, прагне па-за ім і не знойдзе спакою, пакуль не спачне ў Богу[6]: *Deus enim solus satiat*, толькі Бог задавольвае чалавека![7] Толькі Бог у сваёй бясконцасці можа задаволіць бясконцае жаданне чалавечага сэрца, і таму Сын Божы хацеў стаць нашым братам і Адкупіцелем.

8. Мы ўжо казалі, што Нікея выразна адкінула вучэнне Арыя. Аднак Арый і яго паслядоўнікі не здаліся. Сам імператар Канстанцін і яго пераемнікі ўсё часцей станавіліся на бок арыянаў. Тэрмін «*homooúsios*» стаў яблыкам разладу паміж нікейцамі і антынікейцамі, выклікаюы далейшыя сур'ёзныя канфлікты. Святы Базыль з Цэзарэі апісвае ўзніклую блытаніну з дапамогай вымоўных вобразаў, параўноўваючы яе з начной марской бітвай падчас моцнай буры,[8] у той час як св. Гілярый сведчыць пра артадоксію свецкіх у параўнанні з арыянствам многіх біскупаў, прызнаючы, што «вушы народу святейшыя за сэрцы святароў».[9]

Апірышчам Нікейскага *Credo* быў св. Атаназій, непахісны і моцны ў сваёй веры. Нягледзячы на тое, што яго пяць разоў пазбаўлялі пасады і высылалі з біскупства ў Александрыі, ён кожны раз зноў вяртаўся туды ў якасці біскупа. Нават з выгнання ён працягваў весці Божы народ праз свае творы і пасланні. Падобна Майсею, Атаназій не змог увайсці ў абяцаную зямлю касцёльнага спакою. Гэтая ласка была пакінута для новага пакалення, вядомага як «маладыя нікейцы»: на Усходзе гэта былі тры кападакійскія Айцы: святы Базыль з Цэзарэі (каля 330-379), якому надалі тытул «Вялікі», яго брат св. Грыгорый з Нісы (335-394) і найбольшы сябар Базыля св. Грыгорый Назіянзскі (329/330-390). На Захадзе важную ролю адыгралі: св. Гілярый з Пуацье (каля 315-367) і яго вучань

св. Марцін Турскі (каля 316-397). А таксама, перш за ўсё, св. Амброзій Міланскі (333-397) і св. Аўгустын з Гіпоны (354-430).

Тром кападакійцам належыць асаблівая заслуга ў распрацоўцы фармуліроўкі Нікейскага *Credo*, якая паказала, што Адзінства і Тройца ў Богу зусім не супярэчаць адно аднаму. У гэтым кантэксце падчас Першага Канстанцінопальскага сабору ў 381 годзе быў сфармуляваны артыкул веры адносна Духа Святога. Такім чынам *Credo*, якое з тых часоў называецца Нікейска-Канстанцінопальскім, гучыць так: «Верым у Духа Святога, Пана і Жыватворцу, які з Айца паходзіць, якому разам з Айцом і Сынам належыць пакланенне і хвала, які прамаўляў праз прарокаў».[10]

Пачынаючы з Халкідонскага Сабору ў 451 г., Канстанцінопальскі Сабор быў прызнаны Сусветным, а Нікейска-Канстанцінопальскае *Credo* было абвешчана паўсюдна абавязковым.[11] Такім чынам, яно ўтварала повязь адзінства паміж Усходам і Захадам. У XVI ст. яго таксама захавалі касцёльныя супольнасці, якія ўзніклі ў выніку Рэфармацыі. Такім чынам, Нікейска-Канстанцінопальскае *Credo* з'яўляецца агульным вызнаннем усіх хрысціянскіх традыцый.

9. Шлях ад Святога Пісання да Нікейскага вызнання веры быў доўгім і паслядоўным — праз яго прыняцце Канстанцінопалем і Халкідонам аж да XVI стагоддзя і нашага XXI. Усе мы, як вучні Езуса Хрыста, ахрышчаныя «ў імя Айца і Сына, і Духа Святога», робім на сабе знак крыжа і атрымліваем благаслаўленне. Кожную малітву псальмамі ў Літургіі гадзінаў мы заканчваем словамі «Хвала Айцу і Сыну, і Духу Святому». Такім чынам, літургія і хрысціянскае жыццё трывала замацаваны ў Канстанцінопальскім *Credo*: тое, што мы вымаўляем вуснамі, павінна ісці ад сэрца, каб гэта было засведчана ў нашым жыцці. Таму мы павінны спытаць сябе: як выглядае духоўнае засваенне *Credo* сёння? Ці адчуваем мы, што гэта датычыць таксама нашай сучаснай рэальнасці? Ці мы разумеем і жывём тым, што вымаўляем кожную нядзелю, і якое значэнне ў нашым жыцці мае тое, што мы вымаўляем?

10. Нікейскае *Credo* пачынаецца з вызнання веры ў Бога ўсемагутнага, Стварыцеля неба і зямлі. Сёння для многіх людзей Бог і пытанне пра Бога амаль не маюць значэння ў іх жыцці. Другі Ватыканскі Сабор падкрэсліў, што хрысціяне, прынамсі часткова, адказныя за гэтую сітуацыю, бо яны не сведчаць пра сапраўдную веру і зацямняюць сапраўднае аблічча Бога ладам жыцця і дзеяннямі, якія адыходзяць ад Евангелля.[12] У імя Бога вяліся войны, адбываліся забойствы, пераслед і дыскрымінацыя. Замест таго, каб абвяшчаць міласэрнага Бога, гаварылася пра помслівага Бога, які выклікае страх і карае.

Нікейскае *Credo* заклікае нас зрабіць рахунак сумлення. Што для мяне значыць Бог і як я сведчу пра сваю веру ў Яго? Ці сапраўды адзін і адзіны Бог з'яўляецца Панам жыцця, а можа ёсць ідалы, важнейшыя за Бога і Яго запаведзі? Ці з'яўляецца Бог для мяне Жывым Богам, блізкім у кожнай сітуацыі, Айцом, да

якога я звяртаюся з сыноўнім даверам? Ці Ён для мяне Стварыцель, якому я абавязаны тым, кім я ёсць і чым валодаю, чые сляды магу знайсці ў кожным стварэнні? Ці гатовы я дзяліцца дабротамі зямлі, якія належаць усім, справядліва і сумленна? Як стаўлюся да стварэння, справы Яго рук? Ці карыстаюся гэтым стварэннем з павагай і ўдзячнасцю, а можа эксплуатую і знішчаю яго, замест таго, каб ахоўваць і даглядаць як агульны дом чалавецтва?[13]

11. У цэнтры Нікейскага-Канстанцінопальскага *Credo* вылучаецца вызнанне веры ў Езуса Хрыста, нашага Пана і Бога. Гэта сэрца нашага хрысціянскага жыцця. Па гэтай прычыне мы абавязуемся ісці за Езусам як за Настаўнікам, спадарожнікам, братам і сябрам. Але Нікейскае *Credo* патрабуе ад нас чагосьці большага: яно нагадвае нам не забываць, што Езус Хрыстус – гэта Пан (*Kyrios*), Сын Бога Жывога, які «дзеля нашага збаўлення зышоў з неба» і памёр «за нас» на крыжы, адкрыўшы нам шлях да новага жыцця праз сваё ўваскрасенне і ўнебаўшэсце.

Вядома, наследаванне Езуса Хрыста – гэта не шырокі і зручны шлях, але гэта дарога, часта патрабавальная і нават балючая, якая заўсёды вядзе да жыцця і збаўлення (пар. *Мц* 7, 13-14). Дзеі Апосталаў кажуць пра новы шлях (пар. *Дз* 19, 9.23; 22, 4.14-15.22), якім ёсць Езус Хрыстус (пар. *Ян* 14, 6): наследаванне Пана абавязвае нас ісці дарогаю крыжа, якая праз пакаянне вядзе да асвячэння і абагаўлення.[14]

Калі Бог любіць нас усёй сваёй істотай, то і мы павінны любіць адзін аднаго. Мы не можам любіць Бога, якога не бачым, не любячы таксама брата ці сястру, якіх бачым (пар. *1 Ян* 4, 20). Любоў да Бога без любові да бліжняга – гэта крывадушнасць; радыкальная любоў да бліжняга, асабліва любоў да ворагаў, без любові да Бога – гэта гераізм, які нас пераўзыходзіць і прыгнятае. У наследаванні Езуса ўзыходжанне да Бога адбываецца праз сыходжанне і прысвячэнне сябе братам і сёстрам, асабліва самым бедным, пакінутым і адкінутым. Тое, што мы зрабілі найменшым з іх, мы зрабілі Хрысту (пар. *Мц* 25, 31-46). Перад абліччам катастроф, войнаў і нядолі мы можам сведчыць пра Божую міласэрнасць да тых, хто сумняваецца ў Ім, толькі калі праз нас яны адчуюць Яго міласэрнасць.[15]

12. Заканчваючы, Нікейскі Сабор застаецца актуальным з-за сваёй выключна высокай сусветнай значнасці. У гэтым кантэксце дасягненне адзінства ўсіх хрысціянаў было адной з галоўных мэтаў апошняга Другога Ватыканскага Сабору.[16] Роўна трыццаць гадоў таму св. Ян Павел II працягнуў пасланне Сабору ў энцыкліцы *Ut unum sint* (25 мая 1995 г.). Такім чынам, разам з вялікай гадавінай першага Нікейскага Сабору мы таксама адзначаем гадавіну першай экуменічнай энцыклікі. Яе можна лічыць своеасаблівым маніфестам, які актуалізаваў тыя ж экуменічныя асновы, закладзеныя Нікейскім Саборам.

Дзякуй Богу, экуменічны рух за апошнія шэсцьдзесят гадоў дасягнуў значных поспехаў. Хоць мы яшчэ не дасягнулі поўнага, бачнага адзінства з праваслаўнымі і ўсходнімі праваслаўнымі Цэрквамі, а таксама з Касцёльнымі супольнасцямі, якія ўзніклі ў выніку Рэфармацыі, экуменічны дыялог прывёў нас, на падставе аднаго хросту і Нікейска-Канстанцінопальскага *Credo*, да распазнання ў братах і сёстрах іншых Касцёлаў і Касцёльных супольнасцяў нашых братоў і сясцёр у Езусе Хрысце, а таксама да адкрыцця адзінай і паўсюднай Супольнасці вучняў Хрыста па ўсім свеце. Разам мы вызнаём веру ў адзінага Бога, Айца ўсіх людзей; разам мы вызнаём адзінага Пана і сапраўднага Божага Сына, Езуса Хрыста, а таксама адзінага Духа Святога, які натхняе і вядзе нас да поўнага адзінства і супольнага сведчання аб Евангеллі. Тое, што нас аб'ядноўвае, сапраўды з'яўляецца чымсьці значна большым за тое, што нас раз'ядноўвае![17] У падзеленым свеце, які раздзіраюць шматлікія канфлікты, адзіная паўсюдная хрысціянская Супольнасць можа быць знакам міру і прыладаю прымірэння, адыгрываючы вырашальную ролю ў глабальным імкненні да спакою. Святы Ян Павел II асабліва нагадаў нам пра сведчанне многіх хрысціянскіх мучанікаў з усіх Касцёлаў і Касцёльных супольнасцяў: памяць пра іх аб'ядноўвае нас і заахвочвае быць сведкамі і будаўнікамі спакою ў свеце.

Каб годна выканаць гэтае служэнне, мы павінны разам ісці да адзінства і прымірэння паміж усімі хрысціянамі. Нікейскае *Credo* можа быць падмуркам і арыенцірам на гэтым шляху. Яно прапануе нам мадэль сапраўднага адзінства ў абгрунтаванай разнастайнасці. Адзінства ў Тройцы, Тройца ў адзінстве, бо адзінства без разнастайнасці – гэта тыранія, а разнастайнасць без адзінства – гэта распад. Трынітарная дынаміка не дуалістычная, як *aut-aut*, што выключае, але з'яўляецца повяззю, якая яднае, у пэўным сэнсе *et-et*: Святы Дух – гэта повязь адзінства, якую мы праслаўляем разам з Айцом і Сынам. Мы павінны пакінуць у мінулым тэалагічныя спрэчкі, якія страцілі свой сэнс, каб дасягнуць агульнага мыслення, і, больш за тое, агульнай малітвы да Духа Святога, каб Ён сабраў нас усіх разам у адной веры і адной любові.

Гэта не азначае паўсюднага вяртання да стану, што быў да падзелаў, ці ўзаемнага прызнання цяперашняга *status quo* разнастайнасці Касцёлаў і Касцёльных супольнасцяў, а хутчэй экуменізм, скіраваны на будучыню, прымірэнне праз дыялог, абмен нашымі дарамі і духоўнай спадчынай. Аднаўленне адзінства сярод хрысціянаў не робіць нас бяднейшымі, наадварот, узбагачае нас. Як і ў Нікеі, гэтая мэта будзе дасягнута толькі праз цярплівы, доўгі і часам цяжкі шлях слухання і ўзаемнага прыняцця. Гэта тэалагічны выклік, а яшчэ больш духоўны, які патрабуе ад усіх пакаяння і навяртання. Таму нам патрэбны духоўны экуменізм малітвы, праслаўлення і пакланення, як гэта было ў выпадку Нікейска-Канстанцінопальскага *Credo*.

Будзем жа заклікаць Духа Святога, каб Ён сапутнічаў нам і кіраваў намі ў гэтай справе.

Духу Святы, Божа, Ты вядзеш вернікаў па шляху гісторыі.

Дзякуем Табе, што натхніў Сімвалы веры і абуджаеш у сэрцах радасць ад вызнання нашага збаўлення ў Езусе Хрысце, Сыну Божым, адзінасутным Айцу. Без Яго мы нічога не можам зрабіць.

Ты, спрадвечны Дух Божы, праз вякі робіш зноў маладой веру Касцёла. Дапамажы нам паглыбляць яе і заўсёды вяртацца да самага важнага, каб абвяшчаць яе.

Прыйдзі, Духу Святы, з полымем Тваёй ласкі, каб ажывіць нашую веру, распаліць у нас надзею і запаліць любоў, каб нашае сведчанне ў свеце не было бясплённым.

Прыйдзі, Боскі Суцяшыцель, Ты, які ёсць суладдзем, каб з'яднаць сэрцы і розумы верных. Прыйдзі і дазволь нам пакаштаваць прыгажосць адзінства.

Прыйдзі, Любоў Айца і Сына, каб сабраць нас у адной аўчарні Хрыста.

Пакажы нам шляхі, якімі мы павінны ісці, каб дзякуючы Тваёй мудрасці мы зноў сталі тым, чым з'яўляемся ў Хрысце – адзінствам, каб свет паверыў. Амэн.

Ватыкан, 23 лістапада 2025 г.
ва ўрачыстасць Езуса Хрыста, Валадара Сусвету

ЛЕЎ XIV

---

[1]Denzinger – Hünermann, *Enchiridion Symbolorum*, Bologna 2018 (d'ora in poi DH), 30.

[2]*Тамсама*, 125.

[3]З выказвання св. Атаназія ў *Contra Arianos* I, 9. Лацінскі пераклад *homooúsios* слушна кажа пра *unius substantiae cum Patre* (пар. *DH* 125).

[4]*Contra Arianos* I, 38, 7- 39, 1.

[5]Пар. *De incarnatione,* 54, *Contra Arianos* I, 39; 42; 45; II, 59ss.

[6]S. Agostino,*Confessiones*, 1.

[7]S. Tommaso d'Aquino, *In Symbolum Apostolorum*, a. 12.

[8]S. Basilio, *De Spiritu Sancto,*30.

[9]S. Ilario, *Contra Arianos, vel Auxentium,* 6. Успамінаючы галасы Айцоў Касцёла, вучоны тэолаг, пазней кардынал, а сёння святы і доктар Касцёла Джон Генры Ньюман (1801-1890)

разгледзеў гэтую спрэчку і прыйшоў да высновы, што Нікейскае *Credo* захавалася ў першую чаргу дзякуючы *sensus fidei* Божага народу. Пар. *On consulting the Faithful in Matters of Doctrine* (1859).

[10]*DH* 150. Сцвярджэнне «і з Айца і Сына (Filioque)» не сустракаецца ў Канстанцінопальскім тэксце; яно было ўключана ў лацінскае *Credo* папам Бэнэдыктам VIII у 1014 годзе і з'яўляецца прадметам праваслаўна-каталіцкага дыялогу.

[11]*DH* 300.

[12]Пар. Другі Ват. Сабор, Паст. канстыт. *Gaudium et spes*, 19.

[13]Пар. Францішак, Апост. ліст *Laudato si'* (24 мая 2015), 67; 78; 124.

[14]Пар. таксама, Апост. адгартацыя *Gaudete et exsultate*(19 сакавіка 2018), 92.

[15]Пар. таксама, Энцыкліка *Fratelli tutti* (3 кастрычніка 2020), 67; 254.

[16]Пар. Другі Ват. Сабор, Дэкрэт *Unitatis redintegratio*, 1.

[17]Пар. S. Giovanni Paolo II, Lett. enc. *Ut unum sint* (25 maggio 1995), 20.

Пераклад Секцыі па перакладзе літургічных тэкстаў і афіцыйных дакументаў Касцёла Камісіі Божага Культу і Дысцыпліны Сакрамэнтаў пры Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў Беларусі